Наименование ТВП: Освейский

© С. Левый

Код: BY001

Географические координаты: 56°05' N 28°07' E

Административная принадлежность: Витебская область: Верхнедвинский район

Площадь: 29654 га

Критерии: A1, B2, A4i

Национальный природоохранный статус: ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Асвейскі»

Международный природоохранный статус: ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 1998 годзе. Рамсарская тэрыторыя з 2002 г. (крытэрый 1a)

Общее описание:

Тэрыторыя заказніка ўяўляе сабой буйны комплекс азёр, лясоў, пераходных і верхавых балот, нізінных балот адносна мала. Ядром заказніка з’яўляецца возера Асвейскае, якое мае важнае гідралагічнае і кліматаўтвараючае значэнне для вялікага рэгіёна паўночнай часткі Беларусі. Вялікую частку ўгоддзя займаюць верхавыя і пераходныя балоты, якія пакрыты хвойнікамі, бярэзнікамі і алешнікамі. Сярод балот раскіданы нешматлікія мінеральныя астравы. Лясы займаюць каля 30% агульнай плошчы заказніка, лугі – 6%, хмызнякамі пакрыта 4% тэрыторыі.

Гідраграфічная сетка добра развіта і прадстаўлена азёрамі, рэкамі і шматлікімі меліяратыўнымі каналамі. Галоўная водная артэрыя тэрыторыі – рака Свольна, якая адносіцца да басейна Заходняй Дзвіны. Найбольш значным натуральным вадаёмам з'яўляецца возера Асвейскае, плошча якога складае 47,95 км2 (пасля Нарачы гэта другі па велічыні прыродны вадаём рэспублікі). Возера адносіцца да эўтрофнага тыпу, яно мелкаводнае, сярэдняя глыбіня не перавышае 2 метраў. У яго ўпадаюць некалькі невялікіх рэк і каналаў, аднак прыток вады ў вадаём адбываецца, галоўным чынам, за кошт ападкаў. Апошнія дваццаць гадоў возера інтэнсіўна зарастае надводнай расліннасцю і паступова страчвае сваё значэнне ў якасці рыбапрамысловага вадаёма і месца гнездавання вадаплаўных птушак. Найбольш верагодная прычына такіх змяненняў – зніжэнне ўзроўню вады, якая выцякае з возера па каналу Дзегцяроўка. Для пад’ёму і стабілізацыі ўзроўню вады ў возеры, на гэтым канале было ўзведзена гідратэхнічнае збудаванне са шлюзам-рэгулятарам, загараджальнай дамбай і водападводзячым каналам. Аднак цяпер дамба знаходзіцца ў нездавальняючым тэхнічным стане. Другой верагоднай прычынай зніжэння ўзроўню вады могуць быць вынікі торфараспрацовак, якія праводзіліся недалёка ад возера.

Лесагаспадарчая дзейнасць на тэрыторыі заказніка вядзецца ў рацыянальных памерах. З іншых відаў гаспадарання пераважаюць здабыча торфу, прамысловы і аматарскі збор грыбоў і ягад, рэгламентаванае паляванне. У Асвейскім возеры ёсць значныя запасы сапрапеляў высокай якасці, прыгодных для прамысловай здабычы.

Основные биотопы:

Лясы - каля 30%, рэдкалессі і хмызнякі - каля 8%, вадаёмы і вадацёкі - каля 26% (з іх воз. Асвейскае - 23%), балоты - каля 22%, лугі (пераважна сенакосныя) - каля 4%, сельгасугоддзі і іншыя трансфармаваныя месцапражыванні - больш 11%.

Птицы:

Арнітафауна прадстаўлена 206 відамі, 174 з якіх гняздзяцца. За 25-летні перыяд у выніку змены экалагічнага становішча, выкліканага зарастаннем возера Асвейскага і некаторых іншых антрапагенных фактараў, адбыліся кардынальныя змены колькасці шматлікіх, у тым ліку ключавых відаў птушак водна-балотнага комплексу. Знізілася колькасць шэрагу відаў качак (нырок-сівак *Aythya ferina* і чубаты нырок *Aythya fuligula*, качка-крыжанка *Anas platyrhynchos*, качка-чырка *Anas querquedula*), лыскі*Fulica atra*, крычак, чайкі-рыбачкі *Larus ridibundus.* Зніклі на гнездаванні чырванашыйная *Podiceps auritus* і шэрашчокая коўры *Podiceps grisegena*. Прыкладна на стабільным узроўні падтрымліваецца колькасць толькі ў вялікай коўры *Podiceps cristatus* і качкі-цыранкі *Anas crecca*, у такіх нешматлікіх відаў як звычайны гогаль *Bucephalaclangula*, качка-лапаноска *Anas clypeata* і шызая чайка *Larus canus* адзначаная некаторая станоўчая дынаміка.

Праз Асвейскі прыродны комплекс праходзіць міграцыя паўночна-усходніх папуляцый вадаплаваючых і каляводных відаў птушак (зарэгістрыраван 41 віў з агульнай колькасцю да 26000 асобін). Найболей высокая канцэнтрацыя вадаплаваючых птушак назіраецца звычайна ў першай дэкадзе кастрычніка. У перыяд вясновай міграцыі варта адзначыць высокую канцэнтрацыю гусі-гуменніцы *Anser fabalis* (3 - 8,5 тыс. асобін) і качкі-свіцьвы *Anas penelope* (3,5 - 4 тыс. асобін). Колькасць шэрага журавля *Grus grus* восенню дасягае 1500-1800 асобін.

Таксама ТВП мае значэнне для захавання значнай колькасці пар на гнездаванні дубальта *Gallinago media* і чаплі-бугая *Botaurus stellaris.*

Другие группы животных:

Выяўлена 23 віда рыб, 9 відаў амфібій, 5 - рэптылій і 38 - звяроў.

Состояние редких видов птиц:

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (1988-2007)	Критерий ТВП
Гуменник *Anser fabalis*	мг	3000-8500 ос	2005-2007	Э		A4i
Пискулька *Anser erythropus*	мг	0-10 ос	2005-2007	П		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (1988-2007)	Критерий ТВП
Шилохвость *Anas acuta*	мг	0-10 ос	2005-2007	П		
Луток *Mergus albellus*	мг	2-40 ос	2005-2007	П		
Крохаль длинноносый *Mergus serrator*	мг	0-5 ос	2005-2007	П		
Крохаль большой *Mergus merganser*	мг	1-10 ос	2005-2007	П		
Куропатка белая *Lagopus lagopus*	гн	6-8 п	2008	Э	↓	
Гагара чернозобая *Gavia arctica*	зал	2-4 ос	2005-2007	П		
Выпь большая *Botaurus stellaris*	гн	20-30 с	2007	Э	↓	B2
Выпь малая *Ixobrychus minutus*	гн	1-3 п	2005-2007	Э		
Черный аист *Ciconia nigra*	гн	4-6 п	2005-2007	Э	↔	
Коршун черный *Milvus migrans*	гн	1 п	2007	Т		
Орлан-белохвост *Haliaeetus albicilla*	гн	1 п	2007	Т	↔	

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (1988-2007)	Критерий ТВП
Змееяд *Circaetus gallicus*	гн	2-3 п	2007	Э		
Малый подорлик *Aquila pomarina*	гн	3-5 п	2007	Э	↔	
Беркут *Aquila chrysaetos*	гн?	+	2005	Т		
Скопа *Pandion haliaetus*	гн	1 п	2007	Т	↓	
Пустельга обыкновенная *Falco tinnunculus*	гн	6-7 п	2005-2007	Э		
Дербник *Falco columbarius*	гн	5-6 п	2007	Э	↔	
Чеглок *Falco subbuteo*	гн	4-5 п	2006-2007	Э	↔	
Погоныш малый *Porzana parva*	гн	5-10 с	2007	Э		
Коростель *Crex crex*	гн	15-25 с	2005-2007	Э		
Журавль серый *Grus grus*	гн	10-15 п	2007	Э	↓	
Журавль серый *Grus grus*	мг	1500-1800 ос	2005-2007	Э	↔	A4i

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (1988-2007)	Критерий ТВП
Ржанка золотистая *Pluvialis apricaria*	гн	5-10 п	2007	Э	↓	
Турухтан *Philomachus pugnax*	гн	1-3 п	2007	Э		
Гаршнеп *Lymnocryptes minimus*	гн	0-2 п	2005-2007	Э		
Дупель *Gallinago media*	гн	10-30 п	2005	Э		A1
Веретенник большой *Limosa limosa*	гн	1-2 п	2007	Э		
Кроншнеп средний *Numenius phaeopus*	гн	3-5 п	2007	Э	↓	
Кроншнеп большой *Numenius arquata*	гн	5-10 п	2007	Э	↔	
Улит большой *Tringa nebularia*	гн	2-5 п	2007	Э	↓	
Чайка малая *Hydrocoloeus minutus*	гн	6 п	2007	Т		
Чайка сизая *Larus canus*	гн	4-6 п	2007	Э	↔	

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (1988-2007)	Критерий ТВП
Филин *Bubo bubo*	гн	1-2 п	2007	Э		
Сыч воробьиный *Glaucidium passerinum*	гн	5-6 п	2006-2007	Э	↑	
Неясыть длиннохвостая *Strix uralensis*	гн	9-10 п	2006-2007	Э	↔	
Неясыть бородатая *Strix nebulosa*	гн	1-3 п	2006	Э		
Сова болотная *Asio flammeus*	гн	0-6 п	2005	Э	↔	
Дятел зеленый *Picus viridis*	гн	1-3 п	2005-2007	Э		
Дятел белоспинный *Dendrocopos leucotos*	гн	10-20 п	2006-2007	Э		
Дятел трехпалый *Picoides tridactylus*	гн	20-30 п	2006-2007	Э		

Другие редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды:

Звяры: барсук*Melesmeles,* бурый мядзьведзь*Ursusarctos*, еўрапейская рысь*Lynx lynx.*

Насякомыя: дазоршчык-імператар *Anaximperator*, бліскучы жужаль *Carabus nitens*

, аксамітніца Юта *Oeneisjutta*.

Расліны: баранец звычайны*Huperziaselago*, гарлачык жоўты малы*Nupharpumila* , журавіны дробнаплодныя*Oxycoccusmicrocarpus*, кізільнік чарнаплодны *Cotoneaster melanocarpus,* марошка прысадзістая*Rubuschamaemorus,* лінея паўночная*Linnaea borealis*, гарычка крыжападобная*Gentianacruciata,* гарычавачка гаркаватая *Gentianellaamarella,* верабейнік лекавы *Lithospermumofficinale,* змеегалоўнік Руйша *Dracocephalumruyschiana,* бадзяк разналісты *Cirsiumheterophyllum,* шпажнік чарапіцавы*Gladiolusimbricatus,* броўнік аднаклубневы*Herminiummonorchis,* ладдзян трохнадрэзаны*Corallorhizatrifida,* ласняк лёзеля*Liparisloeselii,* тайнік яйцападобны *Listeraovata.*

Угрозы:

- антрапагенная эўтрафікацыя возера Асвейскае, якая выклікана сцёкамі вады з сельгасугоддзяў і торфараспрацовак, камунальна-бытавых прадпрыемстваў, жывёлагадоўчых ферм;
- парушэнне гідралагічнага рэжыму ў выніку дзейнасці торфапрадпрыемства;
- памяншэнне ўзроўню вады ў возеры вядзе да змен яе якасных паказчыкаў, хуткаму зарастанню возера, змяншэнню рыбапрадукцыйнасці, зніжэнню яго значэння для вадаплаўных птушак;
- прамысловае рыбалоўства магло стаць адной з прычын памяншэння запасаў рыбы ў возеры;
- пажары на асушанных балотах;

Рекомендации по сохранению:

- Дазволіць працы па аднаўленню натуральнага гідралагічнага рэжыму.
- Увесці перыяды пакою на час гнездавання і міграцыі птушак.
- Мэтазгодна прадугледзець магчымасць кіраванага зімовага выпальвання сухой травяністай расліннасці, для паляпшэння ўмоў пражывання ахоўваемых відаў і папярэджанні пажараў, асабліва ў краявой зоне балота Асвейскае.
- Рэалізаваць мерапрыемствы Плану кіравання заказнікам "Асвейскі", распрацаванага НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсам у 2008 г.

Источники информации:

Асабістыя паведамленні: Астроўскі А.А., Дзмітрынок М.Г.

Положение о республиканском ландшафтном заказнике «Освейский» (утверждено Пост. Совета Министров Республики Беларусь от 03.01.2000 г. № 4).

План управления республиканским ландшафтным заказником «Освейский» (разработан ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам», 2008 г.).

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Бірукоў В.П., Вальчэўскі Э.Э., Іваноўскі У.В., Казулін А.В.).

Составители : Ямінскі Б.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*